Міністр сувязі і інфарматызацыі прыняў удзел у цырымоніі закладкі капсулы з зямлёй, прывезенай з месцаў бітваў на Курскай дузе

16 жніўня 2018 года ў Мінску, у крыпце Храма-помніка ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны, адбылася ўрачыстая цырымонія закладкі капсулы з зямлёй, прывезенай з месцаў бітваў на Курскай дузе падчас Вялікай Айчыннай вайны. Мерапрыемства прымеркавана да вялікай даты - 75-годдзя Перамогі ў Курскай бітве, якое будзе адзначаецца 23 жніўня 2018 года.

«Мы закладваем святую зямлю ў крыпту ў памяць аб тых страшных падзеях, якія адбыліся ў 1943 годзе, - адзначыў міністр сувязі і інфарматызацыі С.П. Папкоў. - Гэтая цырымонія даказвае яднанне нашых народаў, нашы агульныя мэты і сведчыць пра тое, што разам мы непераможныя». Словы шчырай падзякі міністр адрасаваў ветэранам вайны - удзельнікам Курскага бітвы, якія жывуць у Беларусі, якія сталі галоўнымі гасцямі ўрачыстай сустрэчы. Удзельнікаў цырымоніі цёпла прывітаў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі. Ён падкрэсліў, што «нават у той страшнай бітве людзі спадзяваліся, што перамогуць і будуць жыць. У гэтым сіла духу нашага народа. А капсула з зямлёй стане сімвалам адзінства і напамінам пра тое, што адбывалася ў тыя часы, перасцярогай для будучых пакаленняў».

Пасля памятнай малітвы Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі, і міністр сувязі і інфарматызацыі С.П. Папкоў змясцілі капсулу з зямлёй у нішу крыпты.

Дамоўленасць аб перадачы зямлі з месцаў разлютаваных баёў была дасягнутая каля года таму. У беларускую сталіцу капсулу з зямлёй даставіў С.П. Папкоў, які таксама з'яўляецца кіраўніком беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю. Падчас візіту ў г. Курск у пачатку чэрвеня бягучага года ва ўзаемадзеянні з прадстаўнікамі Адміністрацыі Курскай вобласці Расійскай Федэрацыі быў ажыццёўлены забор зямлі з месцаў разлютаваных баёў на Курскай дузе. У капсуле захоўваецца зямля з тэрыторыі пас. Залатухін Залатухінскага раёна Курскай вобласці і з тэрыторыі помніка Героям-артылерыстам, размешчанага ў Паныроўскім раёне Курскай вобласці.

У мерапрыемстве таксама прынялі ўдзел настаяцель Усіхсвяцкага прыходу протаіерэй Фёдар Поўны, саветнік-пасланнік Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь В.А. Гусеў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і культурных устаноў і інш.

У рамках сустрэчы быў арганізаваны відэамост «Мінск-Курск». У Курскай студыі прысутнічалі Мітрапаліт Курскі і Рыльскі Герман, в.а. намесніка губернатара Курскай вобласці Ю.А. Ціпікіна, в.а. старшыні камітэта Адміністрацыі Курскай вобласці па развіцці знешніх сувязяў Н.А. Лакціёнава, а таксама прадстаўнікі дзяржаўных органаў, ветэранскіх арганізацый і, вядома, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.

Перамога на Курскай дузе ў 1943 годзе стала пераломным момантам у ходзе баявых дзеянняў. Беларускі народ паважае і памятае гэту знамянальную падзею, яна назаўсёды застанецца ў

памяці як прыклад найвялікшай мужнасці, гераізму і сілы духу!

ДАВЕДАЧНА

Улетку 1943 г. адбылася выбітная бітва Другой сусветнай вайны - Курская бітва (5 ліпеня - 23 жніўня), у ходзе якой войскі Чырвонай Арміі сарвалі буйное наступленне праціўніка і разграмілі яго стратэгічную групоўку. Германія і яе саюзнікі былі вымушаны перайсці да абароны на ўсіх тэатрах Другой сусветнай вайны. Стратэгічная ініцыятыва канчаткова перайшла ў рукі савецкага камандавання.

У Курскай бітве з абодвух бакоў удзельнічала больш за 4 000 000 салдат і афіцэраў. Перамогай пад Курскам і выхадам войскаў Чырвонай Арміі да Дняпра завяршыўся карэнны пералом у Вялікай Айчыннай вайне.

Свой уклад у гэтую перамогу ўнёс і беларускі народ. За адвагу і мужнасць у баях на Курскай дузе ўлетку 1943 г. звання Героя Савецкага Саюза ўдастоена каля 40 беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі.

ГІСТАРЫЧНЫ ФАКТ

У 1993 годзе да 50-й гадавіны Перамогі ў Курскай бітве быў прымеркаваны міжнародны сверхмарафонскі ваенна-патрыятычны лёгкаатлетычны прабег. Зборныя каманды Калінінградскай вобласці і Беларусі пераадолелі больш за 1000 км па маршруце Калінінград - Вільнюс - Мінск - Бранск - Арол - Курск. У населеных пунктах адбыліся памятныя мітынгі з удзелам мясцовых адміністрацый, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, удзельнікаў прабегу.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/17-08-2018-3393*